## ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫЗНАЧЭННІ СТРУКТУРЫ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ІМЕНАСЛОВА

**Карніеўская Таццяна Анатольеўна**
старшы выкладчык кафедры замежных моў установы адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
кандыдат філалагічных навук
(г. Гомель, Беларусь)

Беларускі іменаслоў як гістарычна сфарміраваны лінгвістычна-грамадскі комплекс не з'яўляецца аднароднай суцэльнай масай. Як і лексічная сістэма беларускай мовы, антрапанімікон мае пэўную структуру, асаблівасці якой мы вызначым у сваім артыкуле.

Асноўным матэрыялам нашага даследавання сталі вынікі анкетавання студэнтаў 1 курса Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта 2012–2015 гадоў навучання, якія пражываюць у Беларусі (прадстаўлены ўсе шэсць абласцей рэспублікі) і з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Напісанне імён на беларускай мове падаецца згодна з пашпартнымі дадзенымі. Колькасць носьбітаў складае 380 асоб мужчынскага і 1204 асобы жаночага полу. Перавага колькасці жаночага іменаслова над мужчынскім тлумачыцца суадносінамі колькасці асоб у групах адзначанай установы. Размеркаванне носьбітаў па гадах нараджэння выглядае наступным чынам: 1991 – 13, 1992 – 14, 1993 – 21, 1994 – 203, 1995 – 507, 1996 – 508, 1997 – 318 асоб. Што тычыцца месцаў асноўнага пражывання, то карціна наступная: Брэст і Брэсцкая вобласць – 236, Віцебск і Віцебская вобласць – 49, Гомель і Гомельская вобласць – 927, Гродна і Гродзенская вобласць – 21, Магілёў і Магілёўская вобласць – 253, Мінск і Мінская вобласць – 98 асоб.

Вызначэнне структуры беларускага іменаслова канца XX стагоддзя з пункту погляду папулярнасці антрапонімаў найлепш праводзіць з выкарыстаннем колькасна-якаснага метаду і статыстычных падлікаў.

По выніках праведзенай апрацоўкі дадзеных можна вылучыць чатыры групы ўжывальнасці імён: папулярныя, ужывальныя, рэдкія і адзінкавыя. Найбольш папулярныя імёны ўваходзяць у так званую дзясятку папулярнасці.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У разглядаемым іменаслове ў азначаную групу ўключаны наступныя мужчынскія антрапонімы: *Уладзіслаў, Дзмітрый, Павел, Аляксандр, Аляксей, Андрэй, Арцём, Яўгеній, Антон, Іван*; сярод найбольш папулярных жаночых імён вызначаюцца наступныя адзінкі: *Анастасія, Кацярына, Вікторыя, Вольга, Ганна, Юлія, Таццяна, Дар'я, Марыя, Крысціна*. Такім чынам, дзесяццю самымі папулярнымі антрапонімамі ахоплена 206 асоб мужчынскага полу (54,21% ад усяго іменаслова) і 636 асоб жаночага полу (52,82%).

Усяго за адзначаны перыяд у разглядаемым іменаслове было ўжыта 66 мужчынскіх і 84 жаночыя імёны, што робіць каэфіцыент папулярнасці роўным 6 у мужчынскім антрапаніміконе і 14 у жаночым. Такім чынам, ужывальнымі з'яўляюцца мужчынскія імёны *Дзяніс, Ілья, Кірыл, Максім, Мікалай, Мікіта, Сяргей, Уладзімір, Юрый, Ягор*. Агульная колькасць носьбітаў складае 85 асоб, што адпавядае 22,37% ад усяго мужчынскага іменаслова. У дадзеную групу папулярнасці ўваходзяць таксама жаночыя антрапонімы *Аксана, Алеся, Аліна, Аляксандра, Валерыя, Вераніка, Ірына, Ксенія, Марына, Настасся, Наталля, Святлана*. Колькасць носьбітаў прыведзеных жаночых імён складае 319 чалавек (26,5% ад усяго жаночага іменаслова).

Адзінкавых імён у разглядаемым іменаслове зарэгістравана 59, з іх 27 мужчынскіх (*Антоніа, Валянцін, Георгій, Герман, Даніал, Ілля, Лайт, Лявон, Мехдзі, Міраслаў, Рустам, Халіл* і інш.) і 32 жаночыя (*Алана, Армінэ, Арына, Бажэна, Бенядзікта, Васіліса, Гюляр, Дарына, Екацярына, Зоя, Інэса, Лідзія, Медзіна, Нарынэ, Сняжана, Эвяліна, Эліна, Юліана, Яраслава* і інш.). Усяго адзінкавыя імёны складаюць 7,11% мужчынскага іменаслова і 2,66% жаночага.

Сярод адзінкавых імён даволі выразна вызначаюцца групы паходжання: варыянты папулярных антрапонімаў (*Данііл, Ілля*; *Арына, Екацярына, Дарыя*), славянскія малаўжывальныя імёны (*Міраслаў, Усевалад*; *Бажэна, Сняжана, Яраслава*), заходнія антрапонімы і іх варыянты (*Томаш, Рышард*; *Інэса, Эвяліна*), але найбольш значную групу ўтвараюць нацыянальныя антрапонімы, нададзеныя ў неславянскіх і змешаных сем'ях (*Даніал, Джават, Лайт, Мехдзі, Рустам, Халіл*; *Алана, Армінэ, Гюляр, Ілізабель-Мар'ям, Медзіна, Нарынэ*).

Астатнія антрапонімы, якія не ўвайшлі ні ў адну з разгледжаных груп, можна класіфікаваць як рэдкія. У мужчынскім іменаслове гэта імёны з каэфіцыентам ужывальнасці ад 2 да 6 (складаюць 16,31% мужчынскага антрапанімікона), у жаночым – з каэфіцыентам ад 2 да 13 (складаюць 15,02% жаночага антрапанімікона). Дадзеную групу фарміруюць наступныя онімы: *Багдан, Вадзім, Віктар, Вячаслаў, Глеб, Канстанцін, Леанід, Міхаіл, Фёдар; Анжаліка, Валянціна, Вера, Віялета, Галіна, Дзіяна, Жанна, Ілона, Інга, Карына, Лілія, Людміла, Надзея, Наталія, Паліна, Сафія, Яніна* і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Наглядна структура ўжывальнасці адзінак беларускага антрапанімікона прыведзена на схемах 1 і 2.

**Схема 1 – Структура мужчынскага іменаслова канца XX стагоддзя**




**Схема 2 – Структура жаночага іменаслова канца XX стагоддзя**




Такім чынам, можна зрабіць наступныя вывады:

У сучасным беларускім іменаслове даволі выразна вылучаюцца наступныя групы ўжывальнасці імён: папулярныя, ужывальныя, рэдкія і адзінкавыя.

Структура мужчынскага і жаночага іменасловаў з пункту погляду ўжывальнасці антрапонімаў амаль што супадае. Асабліва гэта тычыцца груп папулярных і рэдкіх імён.

Склад вызначаных груп папулярнасці онімаў і працэнтныя суадносіны паміж імі паступова змяняюцца з цягам часу, аднак наяўнасць саміх груп застаецца нязменнай.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова